Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная
бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел маркетынгу

# Пашыраем межы: бібліятэка як прастора інклюзіі для людзей з ментальнымі асаблівасцямі

Гродна
2022

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел маркетынгу

# ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ:

## БІБЛІЯТЭКА ЯК ПРАСТОРА ІНКЛЮЗІІ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ З МЕНТАЛЬНЫМІ АСАБЛІВАСЦЯМІ

Гродна
2022

Складальнік: А. С. Рубель

Рэдактар: Н. Ю. Наземцава

Метадычны дапаможнік

**Пашыраем межы**: бібліятэка як прастора інклюзіі для людзей з ментальнымі асаблівасцямі / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, аддзел маркетынгу ; склад. А. С. Рубель ; рэд. Н. Ю. Наземцава. — Гродна, 2022. — 16 с.

Выданне змяшчае інфармацыю пра вопыт работы па абслугоўванні дзяцей, падлеткаў і моладзі з ментальнымі парушэннямі ў ДУК «ЦБС г. Гродна».

Адрасавана бібліятэчным спецыялістам.

© Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», 2022

# **ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ:**
## бібліятэка як прастора інклюзіі для людзей з ментальнымі асаблівасцямі

Ментальныя парушэнні – цяжкія парушэнні псіхічнага развіцця чалавека, пры якіх страчваецца здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння і паводзін. Такія людзі маюць шэраг спецыфічных асаблівасцей, якія праяўляюцца ў інертнасці, пасіўнасці, парушэнні рухальных і маўленчых функцый, зніжэнні пазнавальнай цікавасці. Пры гэтым, большасць з іх маюць такія ж інтарэсы і патрэбы, як і людзі без псіхафізічных абмежаванняў. Яны вядуць даволі актыўны лад жыцця: вучацца, працуюць, займаюцца творчасцю.

Абслугоўванне карыстальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя – адзін з важных накірункаў дзейнасці дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» (далей – ЦБС г. Гродна).

Штогод гарадскія бібліятэкі наведваюць больш за 200 чытачоў з ментальнымі парушэннямі. Яны атрымліваюць у карыстанне каля 3000 экзэмпляраў кніг, перыядычных выданняў і іншых дакументаў.

З мэтай папулярызацыі чытання сярод дзяцей, падлеткаў і моладзі з ментальнымі асаблівасцямі, уключэння іх у сацыякультурную дзейнасць бібліятэкары ЦБС г. Гродна ў 2021 годзе рэалізавалі інклюзіўны праект **«ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ»**.

**Задачы праекта**:

- Далучэнне да кнігі і чытання дзяцей, падлеткаў і моладзі.
- Інфармацыйная падтрымка адукацыйнага працэсу навучэнцаў.
- Развіццё творчых здольнасцей карыстальнікаў.
- Арганізацыя вольнага часу наведвальнікаў.

**Удзельнікі праекта:**

- Аддзел абслугоўвання дзяцей Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка.
- Бібліятэка-філіял № 3.

- Бібліятэка-філіял № 4.
- Бібліятэка-філіял № 5.

**Сацыяльныя партнёры:**

- Аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна».
- Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дапаможная школа № 1 г. Гродна»
- Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 12 г. Гродна».

**Кіраўнік праекта:**

Ульяна Мікалаеўна Сушчэўская, бібліятэкар аддзела абслугоўвання дзяцей Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка.

Далучэнне да кнігі і бібліятэкі – абавязковая ўмова паўнавартаснай сацыялізацыі карыстальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя. Дзейнасць гродзенскіх бібліятэкараў заключалася ў прадастаўленні ім неабходнай інфармацыі, у падборы і рэкамендацыі літаратуры, арганізацыі вольнага часу.

У рамках інклюзіўнага праекта **«ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ»** ў бібліятэках адбыліся 92 займальныя і пазнавальныя мерапрыемствы, якія спрыялі ўключэнню наведвальнікаў у грамадскае жыццё, садзейнічалі павышэнню іх культурнага ўзроўню, развіццю творчых здольнасцей.

28 масавых мерапрыемстваў арганізавалі і правялі супрацоўнікі аддзела абслугоўвання дзяцей Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка (далей – аддзел абслугоўвання дзяцей ГЦБ імя А. Макаёнка) для вучняў дзяржаўнай установы адукацыі «Дапаможная школа № 1 г. Гродна» (далей – дапаможная школа № 1).

Бібліятэкары ладзілі мерапрыемтсвы, якія спрыялі **духоўна-маральнаму выхаванню** падрастаючага пакалення. Наведвальнікам імкнуліся данесці асаблівасць і ўрачыстасць святаў Нараджэння Хрыстова і Вялікадня.

У студзені для вучняў дапаможнай школы № 1 у аддзеле абслугоўвання дзяцей ГЦБ імя А. Макаёнка арганізавалі калядную варажбу па кнігах. З навагодне-калядных твораў падлеткам прапанавалі даведацца, ці споўняцца іх запаветныя жаданні.





У красавіку прайшла гадзіна духоўнасці «Вялікдзень радасць нам нясе». Школьнікі пазнаёміліся з велікоднымі традыцыямі, даведаліся аб розных тэхніках афарбоўвання яек. Напрыканцы паўдзельнічалі ў конкурснай праграме і зрабілі віншавальныя паштоўкі для сваіх блізкіх і сяброў.

Значную ўвагу надавалі **патрыятычнаму выхаванню** дзяцей і падлеткаў. Падчас віртуальнага «Падарожжа ў мінулае» бібліятэкары расказалі пра тое, які быў горад Гродна ў мінулым і, што адбывалася на знаёмых вуліцах сто гадоў таму.





На літаратурнай гадзіне «Сябры роднай мовы» школьнікі даведаліся, чаму трэба любіць і паважаць родную мову, успомнілі беларускія вершы і песні, пазнаёміліся з творамі сучасных беларускіх аўтараў.

Падчас інфарміны «Сімвалы маёй Радзімы» вучням патлумачылі значэнне слоў «герб», «сцяг», «геральдыка». Разам прасачылі гісторыю ўзнікнення дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь і ўдзельнічалі ў віктарыне «У краіне Сімволіка».





З мэтай **экалагічнага выхавання** правялі відэазагадзіну «Прывіды мёртвага горада». Падлеткі даведаліся пра прычыны трагедыі на Чарнобыльскай АЭС, людзей, якія сталі на барацьбу з катастрофай, паглядзелі фільм «Чарнобыль. Як гэта было».



На **папулярызацыю мастацкіх твораў** былі накіраваны літаратурныя гадзіны «Навасёлы народ вясёлы: да 90-годдзя П. Місько», «Знаёмы незнаёмы Аляксандр Пушкін». Падчас віртуальнай экскурсіі «Па Максімавых сцежках» школьнікі адправіліся ў мінулае стагоддзе, каб прайсці па жыццёвых дарогах паэта Максіма Багдановіча. Праслухалі вершы аўтара і паглядзелі відэасюжэт пра дом-музей Максіма Багдановіча.



Літаратурную гадзіну «Нясумныя кнігі для ўсёй сям'і» бібліятэкары прысвяцілі адраджэнню традыцый **сямейнага чытання** – дзецям прапанавалі творы, якія яны з задавальненнем пачытаюць разам з бацькамі ў вольны час.

Спадабаліся дзецям і падлеткам **інтэрактыўныя гульнявыя мерапрыемствы**. Падчас пазнавальна-забаўляльнай праграмы «Настольныя гульні ад Старажытнага Егіпта да нашых дзён» бібліятэкары расказалі пра гісторыю з'яўлення настольных гульняў і іх разнастайнасць сёння. Знаёмства з правіламі гульні ў шахматы, лато, даміно і сучаснымі гульнямі «Зеллеварэнне», «Мемо», «Уно», якія спрыяюць развіццю ўважлівасці і кемлівасці, дазволіла правесці час весела. Наколькі цікавыя настольныя гульні, удзельнікі пераканаліся, калі адгадвалі назвы песень і вершаў у гульні «Кракадзіл».



Пазнавальная гадзіна «Minecraft. Гісторыя стварэння» пра папулярную сярод моладзі гульню, пазнаёміла з новымі лакацыямі і персанажамі Minecraft. Напрыканцы падлеткам прапанавалі вімельбухі з героямі гульні.

Бібліятэкары ладзілі **майстар-класы**, удзельнікі якіх займаліся аплікацыяй і маляваннем, майстравалі з прыроднага матэрыялу. Заняткі дапамагалі развіваць творчае мысленне, увагу, працавітасць.



Падчас майстар-класа «Кветка дабрыні» з пластыліну і ватных палачак стварылі прыгожыя дзьмухаўцы. Сказаўшы цёплыя словы, кожны творца падарыў сваю кветку сябру.

Школьнікі праявілі свае мастацкія здольнасці ў майстэрні «Я малюю мульцікі» – па музычным урыўку адгадвалі, з якога фільма мелодыя, і малявалі героя-выканаўцу.



Для вучняў інклюзіўнага 4 «Г» класа дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 12 г. Гродна» ў аддзеле абслугоўвання дзяцей ГЦБ імя А. Макаёнка арганізавалі майстэрню па стварэнні восеньскай паштоўкі і гульнявую праграму «Цукеркавы настрой». На «салодкай» імпрэзе дзеці даведаліся, як з’явіўся шакалад, з чаго яго вырабляюць, якія кандытарскія фабрыкі ёсць у Беларусі, адказалі на пытанні віктарыны і атрымалі прысмакі.



Супрацоўнікі бібліятэкі-філіяла № 3 вучням інклюзіўнага класа сярэдняй школы № 12 прапанавалі гадзіну дабрыні «Вам дорым дабрыню і радасць» і гульнявую праграму «Мы ўмеем майстраваць, весяліцца і сябраваць», падчас якой дзеці адказвалі на пытанні віктарыны на зімовую тэму і стварылі навагоднюю паштоўку.

31 тэматычнае мерапрыемства ў рамках праекта **«ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ»** правялі для вучняў дапаможнай школы № 1 супрацоўнікі бібліятэкі-філіяла № 5. Большасць з іх была накіравана на **далучэнне моладзі да чытання лепшых твораў мастацкай літаратуры**.



Падчас літаратурнай гадзіны «Мая душа адкрыта» падлеткі пазнаёміліся з творчасцю паэта Віктара Кудлачова – чыталі яго вершы, адгадвалі загадкі.

У наступны раз бібліятэкары зрабілі агляд серыі кніг амерыканскага пісьменніка Джэймса Дэшнера «Беглы ў лабірынце». Школьнікі паслухалі факты з біяграфіі аўтара, пазнаёміліся з сюжэтам кніжнай серыі і яе героямі, буктрэйлерамі па творах Дж. Дэшнера.

Літаратурная гульня «Героі любімых кніг» і «Кніжная вечарына» прадаставіла вучням магчымасць расказаць пра свае любімыя творы, паўдзельнічаць у віктарыне, конкурсах, пазнаёміцца з новымі кнігамі і перыядычнымі выданнямі.

Падчас дыскусіі «Праз чытанне – да развіцця асобы» бібліятэкары разам з падлеткамі шукалі аргументы на карысць друкаванай кнігі і абмяркоўвалі пытанні – ці змогуць сучасныя тэхналогіі выцесніць кнігу, лепш гаджэты або традыцыйны носьбіт. Кожны з вучняў зрабіў для сябе выснову.



**Выхаванню любові да роднай мовы** была прысвечана літаратурная гадзіна «Мая мова – мой свет, мая душа». Школьнікі адгадалі загадкі, прачыталі вершы на беларускай мове, пазнаёміліся з тэматычнай выставай літаратуры.

Пра ўзнікненне славянскай азбукі і яе стваральнікаў Кірыла і Мяфодзія паведаміла віртуальнае падарожжа ў гісторыю пісьменства «Спадчына славянскіх народаў». Вучні адказалі на пытанні віктарыны

пра кнігі, літары, граматыку і выканалі заданні «Расшыфруй сказ», «Адгадай слова».

На **духоўна-маральнае выхаванне** дзяцей было накіравана гучнае чытанне і абмеркаванне твора Уладзіміра Маякоўскага «Што такое добра і што такое дрэнна». Школьнікі разважалі над маральным выбарам чалавека, паабяцалі рабіць толькі добрыя ўчынкі, прыносіць радасць блізкім.



Ладзіліся ў бібліятэцы № 5 мерапрыемтсвы, спрыяльныя **экалагічнаму выхаванню** падрастаючага пакалення. Падлеткі адказвалі на пытанні віктарыны «Дзівосны свет жывёл», а за правільныя адказы атрымлівалі налепкі.

Відэагадзіна «Незвычайныя жывёлы планеты» і віктарына «Адгадай жывёлу» прадоўжылі тэму жывёльнага свету і пашырылі экалагічны кругагляд школьнікаў.

Віртуальнае «Падарожжа ў касмічную прастору» спрыяла пазнанню найцікавейшых таямніц космасу. Вучні даведаліся пра планеты Сонечнай сістэмы, адгадалі загадкі і рэбусы, паглядзелі відэасюжэты.

Бібліяграфічны агляд «Казачны свет прыроды» пазнаёміў з кнігамі і перыядычнымі выданнямі экалагічнай тэматыкі.



З мэтай **сямейнага выхавання** адбылася гадзіна дабрыні «Мілая матуля». Падлеткі дэкламавалі вершы, удзельнічалі ў конкурсе «Хто больш ведае чароўных слоў пра маму», віктарыне «Лепшыя казачныя матулі», адгадвалі музычныя загадкі, пазнаёміліся з выданнямі літаратурнай выставы «Ты адна такая – любімая і родная».

Творчая майстэрня «Адзінай маме на свеце» дапамагла школьнікам з дапамогай бібліятэкараў стварыць віншавальныя паштоўкі для сваіх матуль.

Бібліятэкі-філіялы № 4 і № 5 у рамках праекта **«ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ»** працавалі з аддзяленнем дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна». Арганізацыя вольнага часу наведвальнікаў Цэнтра ў бібліятэцы – крыніца дадатковых магчымасцей папулярызацыі чытання, знаёмства з сусветнай і айчыннай культурнай спадчынай, садзейнічання духоўнаму, этычнаму і эстэтычнаму выхаванню моладзі.

Пры бібліятэцы-філіяле № 4 для маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя дзейнічае клуб «Калейдаскоп». Аб'яднанне налічвае 30 удзельнікаў. У 2021 годзе адбылося 20 разнастайных па тэматыцы мерапрыемстваў. Сярод іх:

- гадзіна інфармацыі «Беларусь – мая краіна» да Года народнага адзінства – пра дзяржаўныя сімвалы і слынных людзей Беларусі;
- гадзіна гісторыі «Пуцяводная зорка беларусаў» – пра дзейнасць асветніцы Еўфрасінні Полацкай;



- пазнавальная гадзіна «У пошуках Краіны здароўя» – пра негатыўны ўплыў шкодных звычак на арганізм чалавека, правілы рацыянальнага харчавання і сакрэты даўгалецця;
- гадзіна здароўя «Азбука вітамінаў» – пра ролю вітамінаў для арганізма чалавека;
- гадзіна інфармацыі «Інтэрнэт – і сябар, і вораг» – аб правілах паводзін у віртуальным свеце;
- экалагічная гадзіна «Зямлянам – чыстую планету» – знаёмства з правіламі эканомнага выкарыстання электраэнергіі і вады, беражлівых адносін да прыродных рэсурсаў Зямлі;
- гадзіна цікавых паведамленняў «Гэтыя дзівосныя жывёлы» – веды пра незвычайных жывёл свету, найцікавейшыя выданні па тэме на выставе літаратуры;

- гадзіна дабрыні «З любоўю да маці» – звесткі пра свята Дзень маці і традыцыі яго адзначэння ў Беларусі і іншых краінах, конкурсна-забаўляльная праграма;
- урок этыкету «Добрыя манеры» – знаёмства з правіламі этыкету ў розных сітуацыях, нормы этыкету у іншых народаў свету;
- бібліяграфічны агляд «Прыйшоў. Убачыў. Прачытаў!» – новыя часопісы і газеты, апошнія навіны з іх, вытрымкі з цікавых публікацый.




Найбольш падабаюцца сябрам клуба «Калейдаскоп» мерапрыемствы **краязнаўчай тэматыкі**. Падчас віртуальнага падарожжа «Гродна: учора, сёння, заўтра» бібліятэкары расказалі пра вехі гісторыі горада і ўнікальныя архітэктурныя помнікі. Відэаролік «Мой горад Гродна» дазволіў убачыць горад на старых і сучасных фотаздымках, а дакументальны фільм «Гарады Беларусі. Гродна» пазнаёміў са славутымі мясцінамі абласнога цэнтра.




У клубе правялі гадзіну мужнасці «Гродна: імёны, подзвігі, памяць» – маладыя людзі даведаліся пра фашысцкія злачынствы ў акупаваным Гродне ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра супраціў салдат і мірных жыхароў. Электронная прэзентацыя прадэманстравала фотаздымкі разбуранага горада таго часу, дакументальны фільм «Падполле Гродна» расказаў пра народную барацьбу з захопнікамі.




Віртуальная экскурсія «Помнікі нашага горада» дазволіла даведацца пра старажытныя і сучасныя помнікі, размешчаныя як у межах Гродна, так і ў бліжэйшых ваколіцах. З сюжэта тэлевізійнага канала «Беларусь 1» сябры

клуба даведаліся пра стварэнне кампазіцыі ў гонар герояў фільма «Белыя росы».



Выклікала цікавасць віртуальная экскурсія ў Гродзенскую аптэку-музей – бібліятэкары пазнаёмілі маладых людзей з экспанатамі музея: калекцыяй аптэчнага посуду, абсталявання, лекавых сродкаў, медыцынскіх інструментаў XVIII-XIX стагоддзяў.



Гадзіна гісторыі «Ведаць, памятаць, ганарыцца» для сяброў клуба «Калейдаскоп» расказала пра дзейнасць знакамітага вучонага Жана Эмануэля Жылібера, а гадзіна мастацтва «Фарбы радасці» была прысвечана 155-годдзю ўраджэнца Гродна мастака Льва Бакста.

Супрацоўнікі бібліятэкі-філіяла № 5 для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна» правялі 11 мерапрыемстваў. Адметнасцю працы з'яўляецца **арганізацыя экскурсій па горадзе і яго ваколіцах**.



Экскурсію на Форт № 2 Гродзенскай крэпасці прымеркавалі да Дня памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

У г. п. Сапоцкін наведалі культурна-турыстычны цэнтр, адзіны ў Беларусі музей Пісанкі і музейную экспазіцыю «Нам засталася спадчына», якая ўключае макеты галоўных славутасцей Гродзенскага раёна.







У Свята-Пакроўскім кафедральным саборы экскурсанты даведаліся пра гісторыю ўзнікнення храма, пазнаёміліся з абразамі, убачылі копію крыжа Еўфрасінні Полацкай, паспрабавалі пазваніць у званы.



Падчас наведвання Свята-Марфінскай царквы пра гісторыю і ўнутранае ўбранне храма расказаў іерэй Аляксандр Гук. Пасля маладыя людзі наведалі магілы героя вайны 1812 года генерала С. Ланскога, купца І. Мураўёва, паэта Міхася Васілька, маці паэта Максіма Багдановіча Марыі Багдановіч.



У Касцёле Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі ксёндз канонік Антоні Грэмза распавёў, як пачалося будаўніцтва храма, хто такая Брыгіта Шведская,



паказаў абразы, біблії і малітоўнікі, галоўны алтар. Напрыканцы наведалі ўнікальную гаспадарчую пабудову касцёла – драўляны лямус.

З **1** па **7 снежня** бібліятэкары бралі ўдзел ва Усерасійскім фестывалі **«Эстафета дабрыні-2021»**, прымеркаваным да Міжнароднага дня інвалідаў. У аддзеле абслугоўвання дзяцей ГЦБ імя А. Макаёнка сярод вучняў дапаможнай школы № 1 правялі



конкурс талентаў «Пазнаёмцеся, гэта Я!». Конкурс даў магчымасць праявіць сябе, а разнастайнасць талентаў прыемна здзівіла бібліятэкараў, бацькоў і настаўнікаў. Пластылінавая лепка, спартыўныя

дасягненні, алмазная вышыўка, складанне вершаў – нямногае з таго, чым парадавалі хлопчыкі і дзяўчынкі. Цырымонія ўзнагароджання даставіла невымоўныя эмоцыі ўсім прысутным.



Супрацоўнікі бібліятэкі № 5 для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна» арганізавалі інтэрактыўную экскурсію «У госці да францысканцаў». З Касцёлам Маці Божай Анёльскай і кляштарам францысканцаў маладых людзей пазнаёміў памочнік настаяцеля храма брат Павел. У касцёле экскурсанты ўбачылі самы стары арган у Беларусі, галоўны двух’ярусны алтар, прысвечаны Маці Божай Анёльскай, алтар Святога Антонія Падуанскага, эмблему францысканцаў і малюнак святога Максіміліяна Кольбэ.



З мэтай уключэння людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя ў сацыякультурную дзейнасць бібліятэкары прапанавалі ім паўдзельнічаць у **анлайн-марафоне «Добрае чытанне»**. Былі падрыхтаваны 36 відэасюжэтаў з запісам чытання вершаў і ўрыўкаў з мастацкіх твораў у выкананні жыхароў Гродна, Гомеля, Брэста і Мінска. Марафон доўжыўся з 1 лістарада да 5 снежня. Усе відэа апублікаваныя на YouTube-канале ГЦБ імя А. Макаёнка.

■ ■ ■

Супрацоўнікі бібліятэк у рамках інклюзіўнага праекта **«ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ»** ладзілі цікавыя мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю кнігі і арганізацыю вольнага часу дзяцей, падлеткаў і моладзі. Бібліятэкары імкнуліся, каб карыстальнікам з абмежаванымі магчымасцямі здароўя было камфортна ў гарадскіх бібліятэках, стараліся акружыць іх увагай, падтрымаць пачуццё ўпэўненасці ў сабе.

# ***ЗМЕСТ***

Пашыраем межы: бібліятэка як прастора інклюзіі
для людзей з ментальнымі асаблівасцямі 3

Метадычны дапаможнік

# ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ:

## БІБЛІЯТЭКА ЯК ПРАСТОРА ІНКЛЮЗІІ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ З МЕНТАЛЬНЫМІ АСАБЛІВАСЦЯМІ

Складальнік
**Рубель** Алена Станіславаўна

Рэдактар
**Наземцава** Наталля Юр’еўна

Камп’ютарная вёрстка
**Рубель** Алена Станіславаўна